Асоба і час

# ЗІНОВІЙ ПРЫГОДЗІЧ:
# *«Шчасце — служыць дабру»*

АЎТАБІЯГРАФІЧНЫЯ НАТАТКІ
ЭСЭ
ІНТЭРВ'Ю

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2022

УДК 821.161.3.09+929 Прыгодзіч
ББК 83.3(4Беи)
З-63

*Серыя заснавана ў 2008 годзе*

Рэдакцыйны савет:
Анатоль Андрэеў, Анатоль Аўруцін, Ліліяна Анцух,
Уладзімір Гніламёдаў, Алесь Карлюкевіч, Алесь Марціновіч,
Валянціна Палaverніна, Міхась Пазнякоў

З-63 **Зіновій** Прыгодзіч : «Шчасце — служыць дабру» : аўтабіяграфічныя нататкі, эсэ, інтэрв'ю. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2022. — 208 с. : [24] л. укл. — (Асоба і час).
ISBN 978-985-581-565-6.

Зіновій Прыгодзіч — вядомы беларускі журналіст, галоўны рэдактар папулярнага ў краіне часопіса «Гаспадыня». Член Саюза пісьменнікаў СССР і Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы. Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь. Аўтар каля 40 мастацкіх і дакументальных кніг. Яго аповесці «Ноч перад нядзеляю», «Журба мая светлая», «Чаромхавыя халады», шматлікія апавяданні і эсэ ўзнімаюць важныя, актуальныя праблемы — лёс сучаснай беларускай вёскі, узаемаадносіны бацькоў і дзяцей, радасці і пакуты першага кахання, прычыны п'янства і іншых амаральных з'яў.

Гэтая кніга ў серыі «Асоба і час» — своеасаблівыя агледзіны пражытага і перажытага пісьменнікам, спроба асэнсаваць сябе ў кантэксце часу. Аўтабіяграфічныя нататкі, артыкулы, эсэ, інтэрв'ю спрыяюць атрыманню чытачом цэласнага ўяўлення пра жыццё і творчасць аднаго з выбітных пісьменнікаў Беларусі.

**УДК 821.161.3.09+929 Прыгодзіч**
**ББК 83.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-581-565-6**

© Прыгодзіч З. К., 2022
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Чатыры чвэрці"», 2022

# ПРА ЧАС І ПРА СЯБЕ

З усіх маіх кніг гэтая — самая асабістая, адкрытая, вольная і самая адказная.

Чаму асабістая — зразумела, бо я наважыўся расказаць пра самога сябе. Мне могуць запярэчыць, што кожная кніга пісьменніка — гэта ў пэўнай ступені аповед і пра самога сябе. Так-то яно так, але ж у мастацкім творы гэты аповед схаваны ў падтэксце, падаецца ўскосна. А тут я асмеліўся сказаць пра сваё, глыбока асабістае прама, адкрытым тэкстам, шчыра і вольна. Дзе ад самога сябе, а дзе вуснамі сваіх сяброў, калег.

Цяпер патлумачу, чаму гэту кнігу лічу самай адказнай. Канешне, я і ў ранейшых сваіх творах падыходзіў да кожнага напісанага слова з усёй сур'ёзнасцю і патрабавальнасцю. Але ў дадзеным выпадку мая адказнасць крыху іншага кшталту. Як вядома, у мемуарнай, аўтабіяграфічнай літаратуры аўтара падсцерагаюць дзве небяспечныя крайнасці: альбо з-за лішняй сціпласці недамаляваць, збедніць свой партрэт, альбо, наадварот, прыхарошыць яго, падлакіраваць, выставіць сябе ў найлепшым святле.

Складаючы гэту кнігу, я ўвесь час думаў пра названыя крайнасці. Вось чаму ў сваіх аўтабіяграфічных нататках стараўся быць гранічна шчырым, максімальна аб'ектыўным, а ў матэрыялах іншых аўтараў дазволіў сабе часам зрабіць некаторыя праўкі — зняць залішне высокія эпітэты, каб сказанае калегамі не ўспрымалася як сяброўская кампліментарнасць.

Ці ўдалося мне пазбегнуць небяспечных крайнасцей, меркаваць табе, мой шаноўны чытач. Скажу толькі адно: гэтая кніга — своеасаблівыя агледзіны пражытага і перажытага, зробленага і нязробленага, спроба асэнсаваць сябе ў кантэксце часу.

# РАЗДЗЕЛ 1

# ТАМ, ДЗЕ ВІСЛІЦА БРУІЦЦА

## ВІРТУАЛЬНАЕ ПАДАРОЖЖА НА МАЛУЮ РАДЗІМУ

У кожнага чалавека ёсць на зямлі свой ціхі, запаветны куток, які мы называем малой радзімай. Куток, дзе закапаны твой пупок. Куток, дзе адзвінела, адцвіло шчаслівае, бесклапотнае дзяцінства. Дзе прамільгнула, як знічка, як ластаўчына крыло, юнацтва. Дзе ўзышла казачная вясёлка першага кахання.

Такім куточкам у маім жыцці стала вёска Лышча, што на Піншчыне. Яна заўсёды і ўсюды ў маёй душы — на вялікіх і малых дарогах. Яна са мною ў маіх радасцях і трывогах, у маіх клопатах і памкненнях. Бацькоўскай хатай, матчынай усмешкай яна прыплывае ў мае сны.

Шмат гадоў ужо прыязджаю я сюды госцем. Спатканні гэтыя напачатку былі светлыя. Радасна было бачыць, як за час тваёй адсутнасці то новы прыгожы дом вырас, то вуліца заблішчэла асфальтам, то ў сяброў нарадзіўся нашчадак.

Пасля нешта незразумелае стала адбывацца з вёскаю. Усё менела ў ёй людзей. Усё радзей гучалі ў родных ваколіцах песні. Усё большала хат з забітымі крыж-накрыж вокнамі.

Цяпер я хаджу тут, як па мінным полі. Болем узрываецца сэрца на кожным кроку. Вёска співаецца, вымірае… Праклятая перабудова нанесла нам незагойныя раны. Але хочацца спадзявацца, што, разваліўшы ўсё дашчэнту, мы не будзем стаяць з апушчанымі рукамі. Прыйшоў час збіраць камяні. Час адбудоўвацца нанова.

І я веру, што так і будзе. Аснова майго аптымізму — багатае і гераічнае мінулае маёй малой радзімы. Каб пераканацца ў гэтым, запрашаю цябе, шаноўны чытач, у сумеснае віртуальнае падарожжа.

***

Кожны раз паўтараецца адно і тое ж.

Як толькі я на сваім аўто зварочваю з «алімпійкі» на Целяханы, да мяне міжволі пачынае падступаць хваляванне. Яно нарастае, мацнее пры пад'ездзе да Лагішына — мястэчка, дзе некалі я правёў два шчаслівыя гады, працуючы ў раённай газеце.

А калі ўжо праеду і Лагішын, міную Мокрую Дуброву і да маёй роднай вёскі Лышча застанецца ўсяго пяць кіламетраў, сэрца ад хвалявання, здаецца, гатова выскачыць з грудзей. Пачынаюцца мясціны, знаёмыя, дарагія з дзяцінства. Злева — Сунічнае. Сюды мы звычайна хадзілі па ягады. Па чарніцы. Не памятаю, каб хоць раз калі збіралі тут суніцы, але ж, мабыць, яны былі, калі так назвалі тутэйшы лес.

У тыя далёкія гады гэта быў прыгожы, векавечны бор. Гонкія, меднаствольныя сосны гаманілі з аблокамі. Паўстагоддзя таму дрэвы выразалі падчыстую. Засталіся толькі шматлікія пянькі, гурбы голля ды рэдкі хмызняк. Праязджаючы міма знявечанага Сунічнага, я ледзь стрымліваў слёзы: здавалася, што гэта не лесу, а асабіста мне нанесена незагойная рана. На шчасце, рана пастуова зажыла. І цяпер тут зноў радуюць вока прыгажуні-сосны, зноў чуюцца звонкія галасы ягаднікаў і грыбнікоў.

Справа, цераз дарогу — гэткі ж сасновы лес, толькі больш густы, зарослы. І называецца ён Корсакава, па імені яго колішняга ўласніка. Не ведаю чаму, але сюды ў ягады мы не любілі хадзіць. Можа таму, што тут заўсёды было сыра, больш камароў і іншай, як у нас кажуць, заедзі. А сырасць ішла ад недалёкага балота, якое мы ўсе ведалі як Галае. Галае — значыць голае, чыстае месца. І сапраўды, тут не расло ніводнага дрэўца, ніводнага кусціка. Затое было шмат журавін.

За Корсакавым лес становіцца прыкметна радзейшым. Недзе паблізу была знакамітая Дзеёва гара. Адкуль такая дзіўная назва? Кажуць, што тут яшчэ за польскім часам жыў ляснік Андрэй, якога звалі чамусьці Дзеём. Ягоны хутар месціўся на невялікай паляне, на пэўным узвышшы, якое маім аднавяскоўцам, звыклым да раўнінных краявідаў, здавалася гарой.

Але чаму яна была знакамітай?

Першая прычына, мабыць, заключалася ў тым, што менавіта тут летам 1944 г., незадоўга да вызвалення, адбылася баявая сутычка партызан з паліцаямі, якія на фурманках вывозілі ў Германію мясцовае насельніцтва. Бой доўжыўся нядоўга: перапалоханыя нечаканасцю атакі, паліцаі паўцякалі хто куды. А жыхары Лышча вярнуліся дадому.

Другая прычына — чыста практычная. Вакол гары было шмат ягадных і грыбных мясцін. І многія мае землякі сваё «ціхае паляванне» пачыналі менавіта адсюль. Цяпер, канешне, ужо не тое — пабяднеў лес, пабяднеў…

І нарэшце трэцяй прычынай была сама гара. Зімою яна рабілася любімым месцам адпачынку ўсіх школьнікаў — ад малодшых да старэйшых класаў. Спусціцца з гары на лыжах, лавіруючы паміж сосен, было немалой рызыкай і, калі хочаце, адзнакаю пэўнай смеласці. Але вышэйшым шыкам лічылася не проста спусціцца, а скокнуць з крутога трампліна. Што ўдавалася далёка не кожнаму. Ды і не кожны адважваўся гэта зрабіць.

А яшчэ Дзеёва гара ў свой час была авеяна мноствам баек, міфаў, легенд. Казалі, напрыклад, што ў наваколлі гары на Купалле (па-нашаму, на Яна) апоўначы зацвітае папараць-кветка, аднак убачыць яе, а тым больш сарваць яшчэ нікому не ўдавалася, бо там водзяць карагод розныя нячысцікі. А вось да цудадзейнай крынічкі, што ціхенька бруілася непадалёку, доступ быў вольны. І нават мы, падлеткі, часта (асабліва перад экзаменамі) бегалі туды, каб напіцца крыштальна-чыстай, сцюдзёнай вадзіцы, бо тады абавязкова будзе ўдача…

Лес паступова пераходзіць у хмызняк, і справа адкрываюцца вясковыя могілкі. Тут — мой першы прыпынак. Я адчыняю рыпучыя дзверцы нядаўна абноўленай агароджы і адчуваю, як сэрца атульвае балючы смутак. З усёй маёй некалі вялікай, працавітай, вясёла-пявучай радні пераважная большасць ужо спачывае на гэтым самотным кавалачку зямлі. У тым ліку і самыя блізкія — маці, бацька, брат, швагер, пляменнікі…

На могілках, учытваючыся ў надпісы на старых, заімшэлых крыжах і сучасных дыхтоўных помніках, з асабліва горкім сумам думаецца: як мала мы ведаем пра свой род-радавод… А тут жа,

у гэтай зямліцы, пахаваны не толькі мае бацькі, але і дзяды, прадзеды і яшчэ многія пра, пра.

***

А цяпер лагічна будзе зазірнуць у мінулае крыху глыбей. Дазнацца пра гісторыю роднай вёскі і яе ваколіц.

Я шмат перагартаў краязнаўчых і навукова-даследчых кніжак, у прыватнасці, грунтоўную працу Юзафа Крашэўскага «Пінск і яго ваколіцы», Дзмітрыя Булгакоўскага «Пінчукі», некалькі кніг ураджэнца Лагішына Адама Нарушэвіча, цяперашняга даследчыка з вёскі Каўняцін Уладзіміра Зянько «Край пад белымі крыламі» і іншыя. Зазірнуў у архівы — гістарычныя, царкоўныя, краязнаўчыя.

І вось аб чым я дазнаўся.

Канкрэтна пра вёску Лышча вестак знайшлося вельмі мала. Затое даволі падрабязна і ярка падаецца гістарычны і сацыяльна-палітычны фон Піншчыны (а гэта значыць і маіх родных мясцін) XIII–XIX стст.

Пінскае ўдзельнае княства ўтварылася ў вярхоўях ракі Прыпяць і нізоўях яе прытокаў Ясельды, Піны, Гарыні. Вылучылася яно з Тураўскага княства паміж 1167 і 1174 гг. Першым пінскім князем быў Яраслаў Юр'евіч, сын тураўскага князя Юрыя Яраслaвіча. У тыя часы было шмат міжусобных войнаў, якія не заўсёды заканчваліся перамогамі нашых землякоў. У XIII ст. пачасціліся набегі літоўцаў на Валынь праз землі Пінскага княства, у час якіх моцна цярпела мясцовае насельніцтва.

У пачатку XIV ст. Пінскае княства ўвайшло ў Вялікае Княства Літоўскае. На працягу амаль двухсот гадоў княства пераходзіла з рук у рукі, імёны шматлікіх уладальнікаў не будзем тут узгадваць — гэта не прынцыпова. А вось тое, што ў 1519 г. кароль Жыгімонт I Стары перадаў княства сваёй жонцы Боне Сфорца — факт надзвычай цікавы. Значыць, тая самая Бона, якая, паводле міфаў, атруціла каханую свайго сына Барбару Радзівіл, уладарыла і ў нашых мясцінах.

Пасля ад'езду Боны Сфорца ў Італію ў 1556 г. княства перайшло яе сыну Жыгімонту II Аўгусту і было ператворана ў староства. Паводле архіўных звестак, да староства належала 101 сяло. З вялікай доляй верагоднасці можна дапусціць, што сюды ўваходзіла і наша мясцовасць.

Чаму я кажу «наша мясцовасць», а не вёска Лышча? А таму, што першае летапіснае ўпамінанне пра вёску значыцца толькі ў 1817 г. У той час як суседнія Забараўцы ўпамінаюцца на трыста дваццаць гадоў раней, у 1495 г. Больш за тое, Забараўцы ў той час былі своеасаблівым апорным пунктам, а навакольныя дробныя пасяленні лічыліся прыватнымі маёнткамі. Адным з іх уладальнікаў быў нехта Лышч, ад прозвішча якога нібыта і пайшла назва вёскі Лышча.

Праўда, існуе і такая версія, напалову казачная, напалову бытавая. Нібыта даўным-даўно адзінокі паляўнічы, прадзіраючыся праз няходжаны гушчар, выбраўся на край лесу і паваліўся ад стомы. Калі ён агледзеўся, ажно знямеў ад захаплення: перад ім прасціраўся маляўнічы поплаў, зрэзаны звілістай стужкай вясёлай рачушкі. Побач з такой светлай прыгажосцю нястрашным было і змрочнае балота, што цямнела ўдалечыні. Паляўнічы хутка перавёз сюды сваю сям'ю, а следам прыйшлі і іншыя палешукі.

Нялёгка жылося перасяленцам. Палеткі, з цяжкасцю адваяваныя ў леса і балота, не маглі пракарміць сялян. Вось чаму, калі сюды завітаў пан і ўбачыў агульную галечу, то ўсклікнуў: «Ну і галішча ж тут! Ну і галішча…» З часам «га» згубілася, і вёска стала называцца Лышча.

Ёсць яшчэ адзін варыянт паходжання назвы нашай вёскі. Зноўтакі, даўным-даўно тут былі дзікія ў сваёй першароднай некранутасці мясціны. Там, дзе цяпер вёска, на дзясяткі вёрстаў навокал распасціралася глухая непраходная багна. Да самага балота падступалі змрочныя, дрымучыя лясы. Такія густыя, што нават хуткаплынная рака Вісліца выгіналася вужакаю, каб прабіцца да вялікай вады.

Ніколі не чуў тут ніхто чалавечага голасу. Толькі вылі па начах воўчыя зграі, глуха рыпелі пад ветрам выгоністыя старыя сосны, уладарна шумелі дубы.

Ды аднойчы прыйшлі сюды людзі. Не ад лёгкага жыцця прыбіліся яны ў гэты куток. Бунтарныя сэрцы шукалі сабе волі і шчасця.

Далей ісці не было куды — балота. Іржавая бясконцая вада з асакой і лазой. Нехта нявесела прысвіснуў:

— Ну і лыка ж, хлопцы, будзе. Ну і лышча!

Усю ноч над Вісліцай гарэлі вогнішчы. Віліся, як дым, неспакойныя людскія думкі. А раніцой з першымі промнямі сонца застукалі

# ЗМЕСТ

Пра час і пра сябе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

**РАЗДЗЕЛ 1. ТАМ, ДЗЕ ВІСЛІЦА БРУІЦЦА**

Віртуальнае падарожжа на малую радзіму . . . . . . . . . . . . . . . 4

Служэнне Яго Вялікасці Слову . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22

Сяброў многа не бывае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34

**РАЗДЗЕЛ 2. НАТХНЁНЫ ПАЛЕССЕМ**

Зіновій. *Н. Гальпяровіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38

Палессе — крыніца натхнення. *Л. Гузарэвіч* . . . . . . . . . . . . . 40

«Айчыну сілкуюць асобы». *І. Урбановіч* . . . . . . . . . . . . . . . . 41

Марыйка, дзве крыніцы і Астана. *І. Ждановіч* . . . . . . . . . . . 44

Дар ад вялікай душы. *І. Ждановіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47

Сэрца сэрцу голас падае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51

**РАЗДЗЕЛ 3. ПЛУГ И БОРОЗДА**

«Творчество и любовь — две великие тайны». *В. Поликанина* . . . 53

«Найти свою тему — и сказать правду…». *В. Поликанина* . . . . . . . 76

«Главное — не согрешить против истины». *В. Поликанина* . . . . . . 97

**РАЗДЗЕЛ 4. ХАРАКТАРЫ І АБСТАВІНЫ**

Багацце студэнцкіх будняў. *А. Акулік* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125

Ноч трывогі і пакут. *А. Сідарэвіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129

Трывожная цішыня. *А. Рагуля* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133

Такая доўгая ноч… *П. Місько* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 136

Характары і абставіны. *Л. Савік* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 143

Споведзь сына. *Я. Сіпакоў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 152
Нельзя человеку без веры, или Ночь заканчивается воскресением. *В. Гришковец* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 153
Хараство паэтычнага свету. *М. Мятліцкі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 155
Імгненні, пачуцці, вечнасць. *К. Ладуцька* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 158
Пра арцёмкавы канікулы. *Н. Каленчыкава* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 162

## РАЗДЗЕЛ 5. ТВОРЧЫЯ ПАРТРЭТЫ

Ён любіў Беларусь нашу мілую.
*Штрыхі да партрэта Я. Сіпакова* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 165
З любоўю і нянавісцю зямною.
*Г. Бураўкін: згадкі і роздум* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 181